БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 947. 6 “1633/1648”: 930.221(043.3) + 947.45“1633/1648”: 930.221(043.3)

На правах рукапісу

ГАЛУБОВІЧ
Віталій Уладзіміравіч

# КНІГІ ЗАПІСАЎ МЕТРЫКІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЗА ЧАС ПРАЎЛЕННЯ УЛАДЗІСЛАВА IV ВАЗЫ ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ.

07.00.09 – гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання

Дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук

Навуковы кіраўнік -
Кандыдат гістарычных навук, дацэнт
Лойка Павел Алегавіч

Мінск 2003

# ЗМЕСТ

УВОДЗІНЫ....................................................................................3

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ.........................................6

1.ГІСТАРЫЯГРАФІЯ І КРЫНІЦЫ..................................................10

1.1.Гістарыяграфія..............................................................................10
1.2.Гісторыя публікацый....................................................................14
1.3.Крыніцы.......................................................................................16

2.КАНЦЫЛЯРЫІ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ЧАС
ПРАЎЛЕННЯ УЛАДЗІСЛАВА IV ВАЗЫ ...................................19

2.2.Арганізацыя працы канцылярый і іх функцыі.......................19
2.1.Штат супрацоўнікаў канцылярый............................................25

3.АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА КНІГ ЗАПІСАЎ.........................34

3.1.Кнігі запісаў у сістэме справаводства канцылярыі ВКЛ................34
3.2.Структура кніг запісаў за час праўлення Уладзіслава IV Вазы.........37
3.3.Дакументальны склад кніг запісаў ..........................................45

4.ІНФАРМАЦЫЙНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ КНІГ ЗАПІСАЎ МЕТРЫКІ
ВКЛ №№106-122..............................................................................49

4.1. Намінацыйныя прывілеі на павятовыя земскія пасады
як крыніца па гісторыі Беларусі.....................................................49
4.2. Матэрыялы па гісторыі скарба ВКЛ.........................................59
4.3. Кнігі запісаў як крыніца па гісторыі гарадоў..........................71
4.4. Дакументы па гісторыі яўрэяў....................................................82
4.5. Кнігі запісаў як крыніца па гісторыі землеўладання................90

ЗАКЛЮЧЭННЕ......................................................................................98

СПІС ЛІТАРАТУРЫ............................................................................101

# УВОДЗІНЫ

Адной з галоўных умоў паступовага развіцця гістарычнай навукі з'яўляецца вывучэнне і абнаўленне крыніцазнаўчай базы даследаванняў. Па сутнасці і гісторыя пачынаецца там, дзе можна гаварыць пра наяўнасць крыніц пазнання, сярод якіх на першым месцы для гісторыка знаходзяцца пісьмовыя крыніцы. Крыніцы з'яўляюцца неабходнай базай кожнай гістарыяграфіі і ў велізарнай ступені фармуюць яе. Асобныя школы ў гістарыяграфіі часам адрозніваюцца толькі глыбінёй ці палітычна-ідэалагічнымі мэтамі інтэрпрэтацыі адных і тых жа крыніц. З'яўленне новых крыніц у большай ступені, чым іншыя фактары ўплывае на працэс вывучэння той ці іншай праблемы. У значнай ступені крыніцы вызначаюць спецыфіку і праблематыку даследаванняў, набор гістарычных метадаў і прыёмаў, неабходных для правядзення даследаванняў. Непазбежным следствам занядбання менавіта крыніцазнаўчых аспектаў гістарычнай навукі можа стаць яе дэградацыя. Канешне, незаўсёды гэта з'яўляецца вінай гісторыкаў. Абмежаваны доступ да архіваў, часам наўмыснае хаванне дакументаў не ў меншай меры ўскладняюць працу гісторыкаў.

Сярод розных відаў гістарычных крыніц велізарную ролю для гістарычных даследаванняў маюць дакументальныя крыніцы, каштоўнасць якіх па-сапраўднаму была ацэнена еўрапейскай гістарычнай навукай толькі ў XIX ст. Пачаткі беларускага крыніцазнаўства таксама маюць карані ў першай палове XIX ст., калі свет пабачыў “Белорусский архив древних грамот”, падрыхтаваны І.І. Грыгаровічам. Менавіта ў першай палове XIX ст. пачынаецца працэс увядзення ў навуковае абарачэнне матэрыялаў з Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), аднаго з буйнейшых комплексаў дакументальных крыніц па гісторыі Беларусі. З гэтага часу і да сённяшніх дзён даследаванне гісторыі беларускіх земляў шчыльна звязана з паралельнай распрацоўкай матэрыялаў архіва канцылярыі Вялікага Княства Літоўскага.

Сімвалічна, што ўздымы айчыннай гістарыяграфіі ў цэлым супадаюць з актуалізацыяй вывучэння і публікацыі матэрыялаў Метрыкі ВКЛ. Станаўленне беларускай навуковай гістарыяграфіі ў другой палове XIX ст. і на пачатку XX ст., па словах Д.І. Даўгялы, у значнай ступені было звязана з пачаткам вывучэння матэрыялаў Метрыкі ВКЛ [27, с. 94]. Дасягненні беларускай гістарыяграфіі ў 20-30-х гадах XX ст. таксама адбываліся паралельна з вывучэннем і публікацыяй метрычных дакументаў. Нарэшце, у сувязі з ростам цікавасці да гісторыі Беларусі з канца 80-х гадоў XX ст. стала відавочна тое, што перспектывы айчыннай гістарыяграфіі, а зараз таксама і яе міжнародны прэстыж, у значнай ступені вызначаюцца і будуць вызначацца ўзроўнем даследаванняў праблем Метрыкі ВКЛ.

Метрыка як комплекс гістарычных крыніц XIV-XVIII стст., безумоўна, мае першазначную каштоўнасць для вывучэння айчыннай гісторыі перыяду сярэднявечча і новага часу. У першую чаргу, гэта абумоўлена разнастайнасцю кампетэнцыі і функцый канцылярыі ВКЛ, у сферу дзейнасці

якой уваходзіла фіксацыя і захаванне вялікакняскіх волевыяўленняў. З іншага боку, нельга не заўважыць, што Метрыка, па меншай меры пэўныя віды кніг, утрымлівае адносна аднастайныя па форме і зместу дакументы, а гэта дае магчымасць праводзіць сістэматызацыю матэрыяла.

На жаль, даследаванне самой Метрыкі як гістарычнай крыніцы шмат у чым спазняецца ў параўнанні з праблемамі, якія можна вывучаць на падставе яе матэрыялаў. Адзначым, што не ўсе кнігі Метрыкі за розныя перыяды дзейнасці канцылярыі ВКЛ вывучаны аднолькава добра. Асабліва гэта датычыцца кніг Метрыкі, адклаўшыхся ў выніку працы канцылярыі ВКЛ у XVII – XVIII стст.

Айчынная і замежная гістарыяграфія неаднаразова звярталася да матэрыялаў Метрыкі ВКЛ першай паловы XVII ст., але ўсе спробы заставаліся бясплённымі для вывучэння асаблівасцяў функцыянавання канцылярыі, зместа і структуры яе кніг. На сённяшні дзень няма ніводнай працы, якую б можна было цалкам пакласці ў падмурак праведзенага аўтарам даследавання. Такая сітуацыя выглядае тым больш парадаксальнай, што дастаткова шмат было зроблена ў справе вывучэння кніг Метрыкі XV-XVI стст. [9, с. 127-128]. Апошняя акалічнасць выразна паўплывала на характар ведаў пра Метрыку XVII ст.: рэаліі XIV-XVI стст. стала пераносяцца на пазнейшы перыяд, не ўлічваючы, што ў канцылярыі, якая працавала на патрэбу дня, за некалькі стагоддзяў адбыліся значныя змены.

Абранне аўтарам прадметам даследавання кніг запісаў Метрыкі ВКЛ за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы як крыніцы па гісторыі Беларусі было вызначана шэрагам абставінаў. У выніку працы з кнігамі запісаў Метрыкі ВКЛ канца XVI - першай паловы XVII стст. было высветлена, што тыя з іх, якія ахопліваюць дакументы за 1633-1648 гг., па сутнасці складаюць асобны своеасаблівы комплекс матэрыялаў, абмежаваны ад кніг запісаў за папярэдняе праўленне значным прабелам дакументаў. Копіі дакументаў кніг запісаў за перыяд праўлення Уладзіслава Вазы характарызуюцца і поўнай дамінацыяй польскай мовы, што таксама істотна адрознівае гэтыя кнігі ад складзеных у час Жыгімонта III. Значным стымулам для вывучэння менавіта кніг запісаў за 1633-1648 гг. стала адсутнасць у айчыннай гістарыяграфіі традыцыі вывучэння комплексаў дакументальных крыніц, якія склаліся за перыяд праўлення асобных манархаў, у дадзеным выпадку Уладзіслава IV Вазы, як і Метрыкі XVII-XVIII стст. увогуле. Адсутнічаюць таксама даследаванні, прысвечаныя аналізу асобных відаў кніг Метрыкі ВКЛ XVII-XVIII стст. Цікавасць уяўляе вывучэнне кніг запісаў у кантэксце працы канцылярыі ВКЛ, што неабходна для больш дакладнага вызначэння яе функцый на розных этапах гісторыі ВКЛ. Аналіз кніг запісаў за 1633-1648 гг. уяўляе значную цікавасць не ў апошнюю чаргу па прычыне неабходнасці прасачыць змены інфармацыйных магчымасцяў Метрыкі адносна гісторыі Беларусі за XV-XVIII стст.

На падставе вывучэння кніг запісаў аўтар імкнуўся закрануць шэраг як новых так і традыцыйных, і не толькі для беларускай гістарыяграфіі, аспектаў гісторыі ВКЛ, якія можна вывучаць з дапамогай матэрыялаў

Метрыкі ВКЛ. Адной з галоўных задач дадзенага даследавання з'яўляецца пашырэнне праблематыкі крыніцазнаўчага вывучэння дакументаў архіва канцылярый ВКЛ.

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ПРАЦЫ.

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.** Абранае для дысертацыйнай працы вывучэнне кніг запісаў Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы знайшло абмежаванае адлюстраванне ў айчыннай і замежнай гістарыяграфіі. Як прадмет асобнага навуковага даследавання тэма ніколі не выступала, а наяўныя працы, што прысвечаныя Метрыцы, маюць ці аглядны характар, ці толькі ўскосна закранаюць праблему. Трэба таксама звярнуць увагу на той факт, што гісторыя Беларусі XVII ст. увогуле асветлена фрагментарна і не ў апошнюю чаргу з-за адсутнасці ў навуковым абарачэнні дакументаў Метрыкі ВКЛ. Вырашэнне актуальнейшых задач айчыннай гістарыяграфіі (вывучэнне гісторыі органаў дзяржаўнай улады ў ВКЛ, эвалюцыі зямельнай уласнасці, палітычнай эліты, генеалогіі, шэрагу праблем эканамічнага развіцця) нельга зрабіць паўнавартасным без аналізу дакументаў кніг запісаў Метрыкі ВКЛ.

Актуальнасць тэмы дысертацыі абумоўлена і ўзрастаючай цікавасцю да Метрыкі ВКЛ на Беларусі і ў суседніх краінах. Абраная тэма мае значэнне для далейшага развіцця даследаванняў па гісторыі Метрыкі ВКЛ у межах станаўлення айчыннага крыніцазнаўства і археаграфіі. Такім чынам, актуальнасць абранай тэмы абумоўлена наступнымі акалічнасцямі:

1. Недастатковасцю вывучэння кніг запісаў Метрыкі ВКЛ за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы як асобнага комплекса дакументальных крыніц, які склаўся ў працэсе працы канцылярый ВКЛ.

2. Неабходнасцю даследавання асаблівасцей працы канцылярый ВКЛ у перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы для высвятлення месца кніг запісаў ў сістэме дзяржаўнага справаводства.

3. Патрэбай у сістэматызацыі і ўвядзенні ў навуковае абарачэнне матэрыялаў кніг запісаў Метрыкі ВКЛ, якія маюць адносіны да гісторыі Беларусі.

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.** Дысертацыя выканана ў межах праграмы даследавання, якое ажыццяўлялася ў 2000 г. на кафедры гісторыі і сацыялогіі Полацкага дзяржаўнага універсітэта ДБ 1720 “Метрыка Вялікага Княства Літоўскага як крыніца па гісторыі Беларусі першай паловы XVII ст.”(№ - 2000899).

**Мэты і задачы даследавання.** Мэтай дысертацыі з’яўляецца навуковае вывучэнне кніг запісаў Метрыкі ВКЛ за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы як гістарычнай крыніцы, характарыстыка відаў дакументаў, арганізацыі і форм працы канцылярый ВКЛ.

Задачы працы:

-даследаваць арганізацыю, асабісты склад і формы працы канцылярый ВКЛ у перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы;

-вызначыць відавыя асаблівасці кніг запісаў Метрыкі ВКЛ;

-вызначыць структуру кніг запісаў Метрыкі ВКЛ у перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы;

-прааналізаваць інфармацыйныя магчымасці кніг запісаў як крыніцы па шэрагу нераспрацаваных і актуальных для айчыннай гістарыяграфіі праблем гісторыі Беларусі (мясцовая земская адміністрацыя ВКЛ, гісторыя скарбу ВКЛ, гісторыя гарадоў, гісторыя яўрэяў, шляхецкае землеўладанне).

**Аб'ект і прадмет даследавання.** Аб'ектам даследавання з'яўляецца Метрыка ВКЛ, кнігі якой захаваліся ў фондзе № 389 Расійскага дзяржаўнага архіва старажытных актаў (далей - РДАСА) у Маскве, мікрафільмы якіх захоўваюцца ў фондзе КМФ-18 Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей - НГАБ) у Мінску. Прадметам даследавання з'яўляецца стуктура і змест кніг запісаў №№ 106-122, іх інфармацыйныя магчымасці для гісторыі Беларусі за вызначаны перыяд.

**Метадалогія і метады даследавання.** Метадалагічным падмуркам даследавання з'яўляюцца як агульнанавуковыя, так і гістарычныя метады. У працы выкарыстоўваліся гістарычна-генетычны, параўнальна-гістарычны, статыстычны, гістарычна-сістэмны, гістарычна-тыпалагічны, рэтраспектыўны метады.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.** Дадзеная праца з'яўляецца першай у айчыннай гістарыяграфіі спробай комплекснага аналізу кніг запісаў Метрыкі ВКЛ за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы. У працы дадзена характарыстыка кампетэнцыі і штата канцылярый ВКЛ за 1633 - 1648 гг. Аўтар прыйшоў да высновы, што ў канцылярыі ВКЛ аднача-сова вялі некалькі серый кніг запісаў. Упершыню дадзена характарыстыка структуры і вылучаны асобныя разнавіднасці кніг па дамінуючым змесце і форме ўпісаў. Даказваецца, што існаванне агульных і "уласных" пячатарскіх кніг запісаў было вынікам неабходнасці фіксаваць асобна публічна-прававыя і прыватныя дакументы. У дысертацыйнай працы ўпершыню ў якасці прадмета даследавання вылучаны намінацыйныя прывілеі і дадзена ім кры-ніцазнаўчая характарыстыка; прадэманстраваны магчымасці кніг запісаў як крыніцы па гісторыі скарба ВКЛ; сістэматызаваны прывілеі на самакіра-ванне, цэхі і іншыя вольнасці, якія захаваліся ў кнігах запісаў; праведзен аналіз матэрыялаў па гісторыі яўрэяў на Беларусі. Адметнасцю дысерта-цыйнага даследавання з'яўляецца вывучэнне асобных відаў дакументаў кніг запісаў Метрыкі ВКЛ па гісторыі землеўладання і землекарыстання ў спалу-чэнні з рэгіянальным падыходам.

**Практычнае значэнне атрыманых вынікаў.** Вынікі праведзенага даследавання могуць выкарыстоўвацца як пры падрыхтоўцы абагульняючых прац па розных аспектах гісторыі Беларусі XVII ст., так і пры напісанні спецыяльных і сінтэзных прац па крыніцазнаўстве гісторыі Беларусі і адпаведных лекцыйных курсаў. На падставе матэрыялаў даследавання яго аўтарам распрацаваны і выкладаюцца спецкурсы "Метрыка ВКЛ як гістарычная крыніца" і "Сацыяльна-эканамічнае і грамадска-палітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVII ст." для студэнтаў спецыяльнасці "Гісторыя" гістарычна-філалагічнага факультэта ПДУ.

**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону:**

1. Праца канцылярый ВКЛ у час праўлення Уладзіслава IV Вазы адбывалася пераважна ў Варшаве, а вызначаныя ў Вільні камяніцы былі толькі месцам захоўвання архіва канцылярый. Побач з асноўнай дзейнасцю па падрыхтоўцы і капіраванні каралеўскіх распараджэнняў, якія адносіліся да ВКЛ, канцылярыі абслугоўвалі ўсходні (маскоўскі) накірунак знешняй палітыкі Рэчы Паспалітай (с. 20-21). Асабістая роля супрацоўнікаў у працы канцылярыі не была аднолькавай і вызначалася ступенню кампетэнтнасці, а таксама ўзроўнем даверу з боку канцлера (с. 23-24).

2. Штат канцылярый ВКЛ, які канчаткова ўсталяваўся ў час праўлення Уладзіслава Вазы, складаўся з кваліфікаваных супрацоўнікаў (с. 28). Канцылярыі ВКЛ забяспечваліся кадрамі з ліку слуг канцлера (падканцлера) - шляхціцаў каталіцкага веравызнання. Асабістая пазіцыя А.С. Радзівіла і іншых службоўцаў у адносінах да рэлігіі стала прычынай шчыльных адносінаў паміж канцылярыямі і каталіцкай царквой, якая пастаўляла з 20-х гадоў XVII ст. кадры для канцылярый, дзе адзін з вялікіх пісараў абавязкова быў духоўнай асобай (с. 29, 31).

3. Кнігі запісаў Метрыкі ВКЛ выконвалі важнейшую функцыю па захоўванні ў выглядзе копій ці скарочанага пераказу каралеўскіх распараджэнняў і прыватных актаў несудовага характару, засведчаных у канцылярыях ВКЛ. У канцылярыях мела месца сарціроўка дакументаў па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыкмеце: уласна ВКЛ, смаленскія і лівонскія матэрыялы (с. 38-39). У структуры кніг запісаў за перыяд праўлення Уладзіслава Вазы вылучаюцца канцлерская і падканцлерская серыі кніг, кожная з якіх складаецца з агульных і "уласных" кніг пячатараў (с. 40-43).

4. Адной з функцый кніг запісаў Метрыкі ВКЛ было захоўванне намінацыйных прывілеяў на цэнтральныя і мясцовыя пасады ў ВКЛ. Намінацыі на павятовыя земскія ўрады ў ВКЛ, нягледзячы на тое, што ў 30-40-я гады XVII ст. скарачаюцца іх інфармацыйныя магчымасці, з'яўляюцца базавай крыніцай для вывучэння рэгіянальных палітычных эліт і павятовай адміністрацыі ВКЛ (с. 53-54, 57-59).

5. Канцылярыі і скарб ВКЛ знаходзіліся ў сталым супрацоўніцтве. Копіі дакументаў, якія захаваліся ў кнігах запісаў, дазваляюць ахарактарызаваць штат супрацоўнікаў скарба ВКЛ (с. 61-63). Матэрыялы фінансавага характару, у тым ліку справаздачы земскіх падскарбіяў па выніках іх дзейнасці, з'яўляюцца каштоўнейшай крыніцай па гаспадарчай гісторыі ВКЛ (с. 68-70).

6. У кнігах запісаў фіксаваліся важнейшыя для розных станаў грамадства і этнічных супольнасцей ВКЛ дакументы, якія рэгламентавалі іх сацыяльна-прававы статус і маёмасныя правы. Трыма асноўнымі адрасатамі дакументаў, копіі якіх захаваліся ў кнігах запісаў, былі шляхта, мяшчане і яўрэі. Спецыфіка адрасата вызначала форму і змест дакументаў: дакументы па гісторыі землеўладання адносяцца пераважна да шляхты; прывілеі на

магдэбургію, цэхі - да мяшчан; наданні і канфірмацыі, якія гарантавалі асаблівы статус - да яўрэяў.

**Асабісты ўклад суіскальніка.** Дысертацыя з'яўляецца вынікам самастойнай даследчыцкай працы. Даследаванне заснавана на матэрыялах Метрыкі ВКЛ, мікрафільмы якой захоўваюцца ў фондзе КМФ-18 НГАБ у Мінску. Праведзеная праца дазволіла значна паглыбіць веды пра структуру і змест Метрыкі, прапанаваць арыгінальны варыянт аналізу кніг запісаў як асобнага комплексу дакументаў за перыяд праўлення Уладзіслава IV Вазы.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы і вынікі праведзеных па тэме дысертацыі даследаванняў былі пакладзены ў падмурак паведамленняў і дакладаў на 14 міжнародных навуковых канферэнцыях: Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Усходнеславянскі сярэднявечны горад” (1997, Віцебск); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 120-годдзю з дня нараджэння У.І. Пічэты (1998, Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Беларускі горад у часе і прасторы: 500 год полацкай магдэбургіі” (1998, Наваполацк); Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Праблемы беларускай археаграфіі” (1999, Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная і літаратурная дзейнасць” (1999, Полацк); Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа” (1999, Гродна); 5-й навукова-краязнаўчай канферэнцыі „Браслаўскія чытанні” (2000, Браслаў); Трэцім міжнародным кангрэсе беларусістаў „Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый” (2000, Мінск); Навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі, прысвечанай 75-годдзю заснавання Полацкага краязнаўчага музея (2001, Полацк); Міжнароднай навуковай канферэнцыі „Традыцыі і перспектывы інстытутаў парламентарызму ў Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, XV-XX стст.” (2001, Мінск); Другой міжнароднай навуковай канферэнцыі “Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць” (2001, Магілёў); Трэціх міжнародных Доўнараўскіх чытаннях у Рэчыцы (2001, Рэчыца); Навуковай канферэнцыі “Этнічныя супольнасці ў Беларусі: гісторыя і сучаснасць” (Мінск, 2001); Міжнароднай навуковай канферэнцыі “Гісторыя Беларусі: праблемы даследавання і выкладання” (Мінск, 2002). Дысертацыя была абмеркавана і рэкамендавана да абароны на пасяджэнні кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта БДУ 18 кастрычніка 2002 г.

**Апублікаванасць вынікаў.** Асноўныя вынікі дысертацыі былі апублікаваны ў 2 артыкулах навуковых часопісаў, матэрыялах 2 зборнікаў навуковых прац і 5 навуковых канферэнцый. Агульны аб'ём апублікаваных прац складае 74 старонкі.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Дысертацыя складаецца з уводзінаў, агульнай характарыстыкі работы, чатырох глаў, заключэння і спіса літаратуры. Агульная колькасць старонак у дысертацыі 108, з якіх бібліяграфія займае 8. Пры напісанні дысертацыі было выкарыстана 127 крыніц.